5 *Маяковский, В.* Берегите трамвай [Электронный ресурс] / В. Маяковский. – Режим доступа : https://rustih.ru/vladimir-mayakovskij-beregite-tramvaj-glavpolitprosvet-208/?ysclid=ly1nvwlbcr933003197. – Дата доступа : 30.06.2024.

6 *Каминская, М. В.* Железная дорога как знак судьбы в творчестве русских поэтов / М. В. Каминская, Ж. Янев, Ю. О. Пазойский // Феноменология транспорта в литературе и искусстве: прошлое, настоящее, будущее : материалы III Междунар. науч.-методолог. конф., Гомель, 26 мая 2023 года / под общ. ред. Т. А. Власюк. – Гомель : БелГУТ, 2023. – С. 70–78.

7 *Маршак, С.* Зимний костёр [Электронный ресурс] / С. Маршак. – Режим доступа : https://poemata.ru/poets/marshak-samuil/zimnie-koster. – Дата доступа : 30.06.2024.

8 *Пастернак, Б.* Свеча горела : стихотворения / Б. Пастернак. – СПб. : Азбука; Азбука-Аттикус, 2023. – С. 279–280.

9 *Тухманов, Д. Ф.* Песни. Для пения (соло, дуэт) в сопровождении фортепиано (баяна, гитары) и для фортепиано, гитары с надписанным текстом / Д. Ф. Тухманов. − М. : Музыка, 1975. − 157 с.

10 *Овчинников, Д.* Шел влюбленный по шпалам [Электронный ресурс] / Д. Овчинников. – Режим доступа : https://proza.ru/2014/07/20/62. – Дата доступа : 30.06.2024.

УДК 82:625.1

*А. Л. КІШТЫМАЎ*
*Рэспубліканская лабараторыя гісторыка-культурнай спадчыны Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, г. Мінск*

## ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ: ПУЦЯВІНЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ

Язэп Драздовіч − беларускі жывапісец, мысліцель, і, без перабольшання, падарожнік. Рэальны − па роднай зямлі і у сваіх творчых памкненнях які выходзіць за зямную арбіту. Першы і самы аўтарытэтны даследчык жыцця Язэпа Драздовіча доктар філалагічных навук Арсен Ліс пісаў: «Шляхі, старыя гасцінцы заўсёды, асабліва ў малідосці, мелі над Драздовічам зваблівую ўладу. Яны адкрывалііі новыя далягляды, вялі да людзей, у шырокі свет разнастайных праяў чалавечай жыцця і неагляднай прыроды. Дарога парывала мастака да новых дзей, абуджала новыя настроі, думкі, абяцала нешта таямнічае»[1, с. 470−471].

І гэта адказвае ісціне: «Я палюбіў бацькаўшчыну нашу, вандруючы па ёй», − казаў сам Язэп Драздовіч, археолаг, небазнаўца, краязнаўца.

Жыццё Язэпа Драздовіча (1888–1954 гг.) праходзіла на фоне самых складаных гістарычных падзей: Першай сусветнай вайны, у якой ён прымаў удзел, рэвалюцыйных пераўтварэнняў, Другой сусветнай вайны. На долю мастака выпала шмат цяжкасцей, звязаных са складанымі жыццёвымі

ўмовамі. Вандруючы па Беларусі, ён збіраў і запісваў фальклор, складаў дыялектычныя слоўнікі, стварыў вялікую колькасць графічных замалёвак.

Язэп Нарцызавіч быў не толькі таленавітым мастаком, але і выбітным пісьменнікам, паэтам, настаўнікам, этнографам, фалькларыстам, філосафам і заснавальнікам беларускай тэарэтычнай астраноміі. Дзісна – Вільня – Саратаў – Іркуцк – Паставы – Орша – Віцебск – Полацк – Смаленск − Вышні Валачок – Мінск – Трокі – Крэва – Гальшаны – Ліда – Наваградак – Любча – Мір – Пінск – Беласток – Глыбокае – Радашковічы − Гданьск. І гэта толькі гарады і буйныя населеныя пункты на жыццёвым шляху Драздовіча. А яшчэ на гэтым шляху мноства беларускіх вёсак, шмат з якіх знайшлі сваё адлюстраванне ў яго творчасці.

Па паўнаце жывапіснага адлюстравання архітэктурнай спадчыны Беларусі Язэп Драздовіч з'яўляецца прамым спадкаемцам Напалеона Орды − мастака другой паловы XIX стагоддзя, аўтара знакамітага цыкла работ пра помнікі архітэктуры былой Рэчы Паспалітай.

За кожным альбомам, за кожным цыклам архітэктурных замалёвак Я. Драздовіча шляхі, якія вялі яго. Дорогі – амаль што абавязковы матыў кожнага краявіду Драздовіча. Часам яны былі і «галоўнымі героямі» яго прац («Гасцінец докшыцкага тракту», «Гасцінец»). Ёсць на іх і прыметы новага часу, напрыклад – чыгунка («Краявід з цягнікам», 1936 г.).

Зямныя шляхі прывялі мастака ў космас. У 1930-х гадах ён стварае цыкл жывапісных работ на касмічную тэму. Сам Я. Драздовіч так тлумачыць гэты, без перабольшання, фантастычны паварот у сваёй творчай біяграфіі: «Усе тыя затраты сродкаў, што ішлі на вядзенне вайны, подуць на заваяванне нявыкарыстаных сіл прыроды дзеля аблягчэння мускульнай працы, а побач з гэтым і на заваяванне прастору не толькі на самой зямлі з яе сухапутнымі абшарамі ды акіянамі, але і па-за атмасфернага, міжпланетарнага. Перад усім таго прастору, які нас раздзяляе з найбліжэйшай планетаю, аднак не з Венераю і не з Марсам, а знашым хоць і надта старым, але яшчэ жывым светам – ясным Месяцам» [2, с. 504−505].

У 1931 г. у Вільні была выдадзена брашура «Нябесныя бегі». У ёй Язэп Драздовіч здолеў стварыць арыгінальную дэталёва распрацаваную сістэму касмалагічных уяўленняў. Сярод касмічных сюжэтаў Я. Драздовіча – і «касмічны» транспарт: месяцовая чыгунка, віядукі, тунэлі, масты, пероны, вакзалы і станцыйныя збудаванні (графічныя творы з серыі «Жыццё на Месяцы»). На ягоных карцінах не толькі жыхары іншых планет, але і зямляне – «касмічныя турысты», як ён іх называў.

Зімой 1931–1932 гадоў Язэп Драздовіч напісаў «Гармонію плянэтаў Сонечнае сыстэмы». Рукапіс адаслаў у Беларускую Акадэмію Навук і суправадзіў яго лістом: «Магчыма, што для Акадэміі навук такое пытаньне, скуль сьвет паўстаў, паўстала гэта зямелька, на якой мы жывем, і гэта ўсяяснае зорнае неба, зусім неактуальнае, але для мяне, як аўтара, які

знайшоў сваё лумачэньне паходжаньня плянэтаў Сонечнай сыстэмы і іх самакручэньня, а таксама гармоніі руху плянэтаў, для мяне гэта вельмі паважная рэч...».

Язэп Драздовіч здолеў стварыць арыгінальную дэталёва распрацаваную сістэму касмалагічных уяўленняў. Ён верыў, што ўсе планеты Сонечнай сістэмы населеныя. Што на Месяцы ёсць жыццё, якое ён падрабязна апісаў у сваіх дзённіках як убачанае ў «самнамбулічных падарожжах». Драздовіч не ведаў матэматыкі, але разлічваў графічна ўзаемаадносіны планет. Там, дзе не хапала тэрмінаў, ён выдумляў уласныя вызначэнні: безэфір'е, касмавізія і г. д.

«Я веру, што тэхніка зямлянаў па заваяванні прастору не скончыцца на тым, што мы ўжо маем, а пойдзець далей аж ды міжпланетарных падарожжаў», – пісаў гэты мастак і мысліцель.

Цяпер, праз стагоддзе, ягоныя словы гучаць як прароцтва: "Прыйдзець час, калі паездка на Месяц акажацца не толькі магчымай, як і цяпер узлёт машынаю на завоблачча. Ці ж мог бы хто сотню гадоў таму гэтаму паверыць". Нагадаю, мінула яшчэ амаль сто гадоў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1 *Ліс, А.* Язэп Драздовіч: Вечны вандроўнік / А. Ліс // Gloria viktis : зб. твораў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2010. – С. 426–528.

2 Язэп Нарцызавіч Драздовіч. Праз церніі да зорак: успаміны, артыкулы, прысвячэнні, мастакія творы / уклад. М. Казлоўскага. – Мінск : Маст. літ., 2014. – 541 с.

УДК 7.049

*В. Г. КУЗНЕЦОВ*
*Белорусский государственный университет транспорта, г. Гомель*

## ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНЫЕ ПЕРЕЕЗДЫ КАК ОБЪЕКТЫ ПРОМЫШЛЕННОГО ПЕЙЗАЖА В ЖИВОПИСИ

Железнодорожный пейзаж можно рассматривать как один из видов промышленного пейзажа. Многие художники обращались к жанру железнодорожного пейзажа в разные эпохи с момента появления железной дороги [1–3]. Сюжеты железнодорожного пейзажа разнообразны:

– изображение эпохальных событий в развитии железных дорог и прежде всего строительство важных объектов: транссибирской магистрали, БАМ, Полесской железной дороги и т. п.;

– изображение человека в его деятельности – создателя, труженика «стальных магистралей» (машинистов, ремонтников и других профессий);